Наталля Стрыбульская

намеснік дырэктара Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы (г. Мінск, Беларусь)

# Міфалагічны кантэкст ландшафтна-мемарыяльнай сістэмы Купалаўскага мемарыяльнага запаведніка «Вязынка»

Асноўным аб'ектам пры раскрыцці заяўленай тэмы з'яўляецца адзін з чатырох філіялаў, якія ў структуры Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы адносяцца да мемарыяльных запаведнікаў, дзе музеефікацыя адбываецца на некалькіх узроўнях: у замкнёнай традыцыйнай прасторы пабудоў і ў прасторы рэальнага натуральнага ландшафту.



Стары фальварак Замбжыцкіх пад прыгожай назвай Вязынка — месца, дзе нарадзіўся будучы народны паэт Беларусі Янка Купала, Іван Дамінікавіч Луцэвіч. З пачатку XIX ст. фарміравалася структура фальварка. Сядзібны дом быў цэнтрам маёнтка, забудову двара складалі гаспадарчыя будынкі — свіран, адрына, стайня, хлявы, ток. Замбжыцкія здавалі зямлю ў арэнду за траціну ўраджаю, у тым ліку і бацькам Яна Луцэвіча, забяспечвалі арандатараў жыллём. Яшчэ напрыканцы 40-х гг. XX ст. былы фальварак меў свой аўтэнтычны выгляд, аб чым сведчаць фотаздымкі таго часу. Апошні ўладальнік фальварка Юзаф Замбжыцкі ганарыўся тым, што Вязынка стала калыскай паэта і рабіў першыя спробы мемарыялізацыі сядзібных аб'ектаў. Але ў 1950-я гг. адбылося разбурэнне культурнага ландшафту, і ад былых пабудоў фальварка застаўся толькі дом арандатараў ці «дом хатковых», у якім і жылі бацькі Янкі Купалы ў 1881—1883 гг. Захаваўся ён менавіта таму, что яшчэ ў 1946 г. на ім была ўсталявана мемарыяльная дошка, а ў 1948 г. тут адкрыўся філіял Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Толькі ў 1972 г. у сувязі з 90-годдзем Янкі Купалы была вынесена пастанова пра стварэнне ў Вязынцы мемарыяльнага запаведніка. Праведзены рэстаўрацыйныя работы ў доме, дзе нарадзіўся паэт, рэканструяваны некалькі пабудоў былой сядзібы Замбжыцкіх. На тэрыторыі запаведніка знаходзяцца камяні-валуны, рака Вязынка, ад якой, верагодна, і атрымала назву месца, старажытнае гарадзішча II — IV стст. н. э., захаваўся натуральны ландшафт былога фальварка.

Дзейнасць па эфектыўным выкарыстанні гістарычнай тэрыторыі, носіць комплексны характар, бо мемарыяльны запаведнік уяўляе сабою складаную сістэму музейных аб'ектаў і ахоўных тэрыторый, аб'яднаных паміж сабой гістарычна і тэматычна. Такім чынам, у Вязынцы існуе кантэкст, у якім гістарычныя падзеі і іх міфалагічны складальнік ўспрымаюцца адэкватна як у рамках прыроднай і інтэр'ернай экспазіцыі, так і ў музейных інтэрпрэтацыях.

Я кажу пра міфалагічны складальнік, бо Іван Луцэвіч народжаны ў містычны час, у купальскую ноч, у дзень летняга сонцастаяння, час актывізацыі ўсіх сіл прыроды, у дзень, які па шэрагу крытэрыяў, ставіцца да найстаражытнага святкавання Навалецця.



Малады Луцэвіч бярэ сабе псеўданім «Янка Купала» і, такім чынам, злучае сябе назаўсёды з адмысловай міфалагічнай сістэмай, складальнікам якой з'яўляецца «салярная сімволіка».

У самім псеўданіме «Янка Купала» прысутнічае сімвалізм як элемент міфалагічнай свядомасці. З захаваннем сімвалам сэнсавай і структурнай самастойнасці звязвае Ю. Лотман яго самую істотную рысу — «сімвал ніколі не належыць якому-небудзь аднаму сінхроннаму зрэзу культуры — ён заўсёды пранізвае гэты зрэз па вертыкалі, прыходзіць з мінулага і адыходзіць у будучыню» [4, *12*].

Зыходзячы з вышэйсказанага, будзе натуральна прапанаваць у якасці асноўнага элемента музеефікацыі тэрыторыі — мадэляванне экспазіцыйнай прасторы, звязанай з Купаллем, як у сістэме замкнёных экспазіцый, так і ў ландшафтна-мемарыяльнай у выглядзе тэатралізаваных рэканструкцый. Такім чынам, спецыфіка гэтага месца будзе вызначана не столькі прадметам, колькі стратэгіяй яго інтэрпрэтацыі.

Мова музейнай экспазіцыі больш за вербальную прыстасавана для перадачы інфармацыі, якую нясе ў сабе сімвал, і для паведамлення ў міфалагічным кантэксце выкарыстоўвае не толькі аптычны канал. Музеефікацыя ландшафтна-мемарыяльнага асяроддзя становіцца адным з найбольш цікавых спосабаў перакадзіравання і мадэлявання прадметаў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і з’яў. Мемарыялізацыя пры міфалагічным кантэксце суправаджаецца змяншэннем ролі ўтылітарных уяўленняў аб мінулым і, адпаведна, павелічэннем удзельнай вагі яго сімвалічнага гучання.

Экспазіцыя ў «доме хатковых» прысвечана нараджэнню чалавека і нараджэнню паэта. Традыцыйны інтэр’ер хаты сімвалізуе цеплыню і шчырасць дома, жылля, бытавых рэчаў — прасторы, дзе нарадзіўся Іван Луцэвіч. Экспазіцыйныя комплексы прадстаўляюць ланцужок фрагментаў з жыцця гістарычных асоб, а таксама вобразы мясцін і пабудоў з імі звязаных: лёс яго продкаў, прыродны і культурны кантэкст існавання будучага паэта, асаблівая атмасфера фальварка, як спалучэнне культуры кніжнай і традыцыйнай народнай культуры, фарміраванне светапогляду маладога Івана Луцэвіча пад уплывам тагачаснай літаратуры, фальклору і гістарычнага ландшафту, міфалагічная сістэма каляндарна-абрадавага свята Купалле. У аснове экспазіцыйнага сюжэта стаіць пытанне «Чаму Іван Луцэвіч узяў сабе менавіта такі псеўданім “Янка Купала”?» Экспазіцыйная прастора арганізавана так, што тэма нараджэння Івана Луцэвіча ў купальскі перыяд і тэма з’яўлення паэта-прарока з псеўданімам Янка Купала закальцаваны.



Адно з самых архаічных свят Купалле захавалася не толькі на ўзроўні геннай памяці, але праводзіцца ў Беларусі на розных пляцоўках, на вялікі жаль, нячаста ў натуральным прыродным асяроддзі, што надае яму ярка выяўленае ўрбаністычнае адценне і адводзіць далёка ад архаічных вытокаў. Тым важней у музейным асяроддзі Вязынкі рэканструкцыя на розных узроўнях абраду, а разам з ім архаічнага Слова песні, замовы, стаўшага крыніцай натхнення Паэта. Такім чынам, развіццё і функцыянаванне музейнай культуры Вязынкі зможа забяспечыць адмысловы спосаб дзейнасці наведвальніка, галоўнае адрозненне якога — дзеянні не толькі з прадметна-матэрыяльнымі фарміраваннямі, але і з ідэальна-вобразнымі сутнасцямі, сімвалічнымі формамі, у тым ліку і з міфалагічнай сістэмай.

Алесь Лозка заве Купалле святам сонца і агню, ушанаваннем, перш за ўсё, вады і спалучанай з ёю расліннасці. Асноўныя сімвалы свята — агонь нябесны і зямны (вогнішча, палаючае кола, паходня, спаленае пудзіла, запальванне пасвета, свечкі), вада, абярэгі, дровы з дуба — сімвалічнага дрэва Перуна, расліны, лекавыя зёлкі, кветка Іван-ды-Мар’я і, канешне, папараць-кветка. «Сягоння ў нас Купала, сам Бог агонь расклаў». Да асноўных рыс Купалля даследчыкі адносяць і культ продкаў, шлюбныя забавы моладзі, гульні з выкраданнем нявест — «Баяры», «Проса», «Ляда», варажбу, існаванне павер’яў пра нячыстую сілу,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

травесцыйныя працэсіі (ад фран. — пераапрананне) — пераапрананне ў маскі з мэтай пераўвасаблення ў іншую істоту і інш. [1, *114—116*].

Народная культура вылучалася высокім кансерватызмам. А значыць, элементы беларускай традыцыйнай культуры непазбежна павінны былі захавацца, што і адзначалі даследчыкі як на пачатку XIX ст., так і ў наступныя стагоддзі. Таксама культура ў сутнасных сваіх характарыстыках гістарычная і крэатыўная, г. зн. гатова ў сучасным кантэксце ствараць новыя артэфакты з дапамогай «артэактаў», да якіх і адносяцца прэзентацыі, інтэрактыўныя праекты, інтэрпрэтацыі, тэатралізацыі.

Культуролагі адносяць музеі да кансервацыйнай культуралогіі, і тут натуральна казаць аб адмысловым відзе кансервацыі абраду і слова. І музейны ўзор становіцца жывым вобразам для суб'екта музеефікацыі, г. зн. наведвальніка. Пажадана б было, каб працэс гэты быў узаемаперaходзячы. Наведвальнік сааўтарствуе з архаічнай культурай, праводзячы мадэляванне абраду, і такім чынам, мемарыялізацыю культурнага і прыроднага асяроддзя пры захаванні яго прыроднасці. Удзел у дзействе, якое мае архаічны сэнс, нават не разумеючы гэтага сэнсу, зачароўвае і абуджае здаровыя інстынкты. Калі казаць пра праблемы захавання спадчыны, то абрад і яго сімвалічныя састаўляючыя ў музейным асяроддзі — гэта аб'яднанне матэрыяльнай спадчыны ў выглядзе нерухомых аб'ектаў і нематэрыяльнага — слова, абраду, песні, танца, гульні. Пра гэта, хоць і ў больш архаічным варыянце пісаў Янка Купала. Такі ўзровень мемарыялізацыі дапаможа прадставіць гэтыя тэксты — вершы і знакавую сістэму абраду свята ў выглядзе дыялогу культур рознага часу.

Гульнёй, як дыдактычным прыёмам, магчыма захаваць як мага даўжэй дзіцячае ўспрыманне жыцця. Слова і рух выяўляюць сябе ў культурна-гістарычным першародстве — і менавіта таму ў самагоднасці музейнага асяроддзя і жывой актуальнасці. І такі зварот да архаічных вытокаў можа стаць самагоднай састаўляючай чалавека, які імкнецца да высокай культуры.

Мэтавая аўдыторыя нашага музея — дзеці. Вязынка — месца, якое злучана з раннім дзяцінствам Івана, адносіцца да вытокаў паэта. І натуральны зварот да міфалагічнай сістэмы Купалля, сістэмы, якая фарміравала і тэматыку вершаў і шмат у чым будучы лад жыцця. Аснова свята — гэта песня, г. зн. таксама Слова. А, па меркаванні дзіцячых псіхолагаў, слова сказанае, ва ўспрыманні дзіцяці ў сілу таго, што яно сказана — у вышэйшай ступені праўдзіва. І, злучанае з рухам,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абрадам — становіцца зрокава-слыхавым ударам, высякае іскру здзіўлення. І для сталай аўдыторыі — гэта зварот да сваіх вытокаў, да дзяцінства жыцця.

Пры стварэнні музейных інтэрпрэтацый у купальскім кантэксце, неабходны прыёмы, прызваныя дапамагчы прычасціцца да сэнсаўрэчаў, сутнасці якіх пазнавальныя ў экспазіцыйнай прасторы — і таму стаўшыя працягам паэта.

У ландшафтна-мемарыяльнай прасторы Вязынкі магчыма фарміраваць шырокую палітру інтэрактыўных адукацыйных праграм пад агульнай назвай «У пошуках папараць-кветкі». Рэалізацыя інавацыйнага праекта «У пошуках папараць-кветкі» ў ландшафтна-мемарыяльным асяроддзі музея — гэта яшчэ і вяртанне да «мовы», таго самага «сродку чалавечых зносін» і «знакавай сістэмы». Парадаксальная праблема беларускага сучаснага кантэксту — дрэннае валоданне роднай мовай. Удзел у беларускамоўным дзействе — гэта своеасаблівы моўны шок і вяртанне да вытокаў, якія жывілі і Янку Купалу.

*Спіс выкарыстаных крыніц*



1. *Лозка, Алесь.* Феномен Новага года ў беларускім фальклоры : манаграфія / А. Лозка ; Бел. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка. — Мінск : БДПУ, 2004. — 161 с. : іл., табл. — С. 125—145.
2. *Лозка, Алесь.* Беларускі народны каляндар / А. Лозка. — 2-е выд., перапрац. і дап. — Мінск : Полымя, 2002. — 238 с. : іл., табл.
3. *Лозка, Алесь.* Беларускі каляндар у славянскім і еўрапейскім свеце : манагр. / А. Лозка ; Бел. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка. — Мінск : ВВЦ БДПУ, 2002. — 120 с. : іл.
4. *Лотман, Ю. М.* Символ в системе культуры / Ю. М. Лотман // ТЭС. — 1987. — № 21. — Вып. 753.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ